**Л.В.Каралькова,**
*аспірантка кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы*

# НАВУЧАННЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ — ВАЖНАЯ ЎМОВА АДРАДЖЭННЯ НАРОДНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Грамадскія працэсы 80—90-х гг. XX ст. спрыяюць пошуку новых шляхоў развіцця культуры. Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці абласных упраўленняў культуры з'яўляюцца адраджэнне народнай культуры, яе самабытных традыцый і фальклору, захаванне і развіццё самадзейнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў.

Праводзяцца конкурсы гарманістаў, прыпевачніц, фальклорныя святы, кірмашы, выставы народнай творчасці, вячоркі, святы вёсак, вуліц, двароў і інш. Усё гэта дае падставы гаварыць пра жыццяздольнасць клубных устаноў, павышэнне іх ролі ў задавальненні культурных патрэб і інтарэсаў насельніцтва. Назапашваецца цікавы вопыт прафілізацыі ўстаноў культуры, больш дакладнага прыстасавання іх да рэальных умоў. Ствараюцца новыя тыпы ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў, цэнтры нацыянальнай культуры, Дамы (цэнтры) рамёстваў, промыслаў, фальклору, народнай творчасці, школы традыцыйнай культуры.

Галоўнае прызначэнне гэтых устаноў — не проста арганізацыя вольнага часу насельніцтва, а правядзенне культурна-асветніцкай навучальна-вытворчай, выхаваўчай, кансультатыўна-метадычнай, камерцыйнай дзейнасці. Такая практыка дае магчымасць не толькі больш уважліва ставіцца да інтарэсаў насельніцтва, але і больш рацыянальна выкарыстоўваць матэрыяльную базу, сродкі, магчымасці спецыялістаў.

Хуткі рост колькасці новых тыпаў устаноў культуры ў сферы традыцыйнай культуры выклікаў патрэбу ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў. На



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сённяшні дзень гэтае пытанне вельмі актуальнае, асабліва для раённых і сельскіх устаноў культуры, дзе востра адчуваецца недахоп высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Новыя канцэптуальныя падыходы да вызначэння прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі, распрацоўка і эфектыўная рэалізацыя абласных і раённых праграм па адраджэнні, захаванні і развіцці традыцыйнай народнай культуры патрабуюць універсальнай падрыхтоўкі работнікаў культуры шырокага профілю, здольных весці навукова-даследчую, арганізацыйна-творчую, выканаўчую дзейнасць, выкарыстоўваючы сучасныя тэхнічныя сродкі.

Для вырашэння пытання падрыхтоўкі спецыялістаў на ўзроўні навучальных устаноў сярэдняга і вышэйшага звёнаў ствараюцца спрыяльныя перадумовы. У перспектыве бачыцца, што сучасная канцэпцыя адукацыі ў вышэйшых навучальных установах у галіне фальклорнай культуры павінна прадугледжваць увядзенне новых самастойных спецыялізацый: педагог-арганізатар школ традыцыйнай культуры, педагог-арганізатар і тэарэтык народных свят і абрадаў, педагог-арганізатар па адраджэнні і развіцці народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў. Новы падыход забяспечыць новы ўзровень кадраў, якія рыхтуюцца ў ВНУ.

Існуе яшчэ адна задача, якая чакае свайго вырашэння, — удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, пераход да сістэмы бесперапыннай адукацыі. Эфектыўнымі формамі павышэння кваліфікацыі з'яўляюцца творчыя майстэрні і лабараторыі, заняткі ў школах народных майстроў, стажыроўкі на базе лепшых устаноў культуры, навучальных устаноў, прафесійных і аматарскіх калектываў, абменныя выезды спецыялістаў, курсы і семінары.

Цікавы вопыт работы ў гэтым кірунку маецца ў Віцебскай вобласці. Там склалася трохступеньчатая (вобласць—раён—сяло) сістэма курсаў народных промыслаў. Навучанне праводзіцца па дванаццамі відах традыцыйных рамёстваў: саломапляценні, ткацтве паясоў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ганчарстве, выцінанцы і інш. Заняткі вядуць высокакваліфікаваныя педагогі, народныя майстры, перыядычна выкарыстоўваецца база Віцебскага вышэйшага вучылішча народных промыслаў (ганчарства, разьба па дрэве, ткацтва на станках).

Асобнае месца сярод формаў павышэння кваліфікацыі павінны займаць навукова-практычныя канферэнцыі, якія аб'ядноўваюць вучоных і практыкаў. Добра было б, каб у практыку ўвайшло правядзенне рэгіянальных навукова-практычных канферэнцый, па выніках якіх выдаваліся б зборнікі тэзісаў, дакладаў і выступленняў, выпрацоўваліся б метадычныя рэкамендацыі. Такія матэрыялы маглі б актыўна выкарыстоўвацца выкладчыкамі, студэнтамі, спецыялістамі і аматарамі народнай творчасці.

**Р.І.Кароткін,**
*аспірант кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## РОЛЯ ТЭХНІЧНЫХ СРОДКАЎ У ПРАЦЭСЕ СТВАРЭННЯ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ВЫЯЎ

Адкрыццё лінейнай перспектывы стала рэвалюцыйнай з'явай у выяўленчым мастацтве і на працягу некалькіх стагоддзяў вызначала яго далейшы лёс. Цікавасць да яе з боку мастакоў была страчана толькі ў часы "другога аптычнага перавароту", звязанага з эксперыментамі кубістаў, а з цягам часу элементы перспектыўнага бачання сталі ўвасабленнем найбольш кансерватыўных тэндэнцый у выяўленчым мастацтве. Нават тады, калі перспектыва як спосаб пабудовы прасторы жывапіснага твора страціла сваю актуальнасць, прынцып цэнтральнай праекцыі працягваў выкарыстоўвацца ў іншых відах мастацтва (фатаграфія, кіно). А з узнікненнем новых тэхналогій — камп'ютэрнай графікі, відэазапісу — лінейная перспектыва захоўваецца як асноўная форма рэпрэзентацыі прасторы, якая з прычыны свайго ўсеагульнага прызнання набыла рысы своеасаблівай візуальнай ідэалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ